# ФАРМІРАВАННЕ НАЦЫЯНАЛЬНАЙ ІДЭІ Ў РАСІІ Ў ЧАС ПРАЎЛЕННЯ КАЦЯРЫНЫ ІІ

Багдановіч А.І.г. Мінск, БНТУ

XVIII ст. – гэта не вельмі спрыяльны час для фарміравання нацыянальнай ідэі і ідэалогіі расійскага самаўладдзя. Значная работа, якая была распачатая ў XVI – XVII стст. апошнімі Рурыкавічамі і першымі Раманавымі па кансалідацыі расійскага грамадства, фарміраванні нацыянальнай свядомасці, ўсведамленні Расіі як сусветнай дзяржавы, была прыпынена. Пятроўскія рэформы, якія былі скіраваныя на гвалтоўнае насаджэнне і ўкараненне ў краіне галандскіх і нямецкіх парадкаў і прыніжэнне ўсяго рускага, як варварскага і адсталага, аказалі адмоўны ўплыў на ўсе бакі жыцця расійскага грамадства. Амаль на трэць скарацілася колькасць насельніцтва краіны. Дзяржаўны апарат, эканоміка і нацыянальная культура аказаліся ў глыбокім крызісе [1, с. 56]. Пасляпятроўскія часы характарызуюцца праўленнем шматлікіх дачаснікаў іншаземнага паходжання, якія, як і былое атачэнне Пятра І, працягвалі раскрадаць краіну, ператвараць большую частку яе насельніцтва ў бяспраўных рабоў. Нашчадкі Пятра вялі сябе на троне як людзі часовыя. Яны імкнуліся скарыстаць сваё становішча для набыцця асабістых выгод.

Толькі пры Кацярыне ІІ пачалі рабіцца захады да вяртання на шлях нацыянальнага адраджэння. Асноўную мэту нацыянальнага адраджэння імператрыца бачыла ў замене палітычных ідэй еўрапейскага абсалютызму, на якія з часоў Пятра І абапіралася царская ўлада, палітычнымі ідэямі самадзяржаўя. Кацярына ІІ разумела, што для таго, каб наблізіць манархію да нацыянальных інтарэсаў, неабходна, каб праваслаўная царква зноў магла стаць духоўным кіраўніком народа, неабходна было вызваліць яе ад кантролю дзяржавы (магчыма, ліквідаваць Сінод і абраць патрыярха), вызваліць ад прыгону сялянства і ва ўсіх выпадках, калі гэта магчыма, кіраванне з дапамогай чыноўнікаў замяніць самакіраваннем [2, с. 87]. Вяртанне Рускай Еўропіі да Русі не магло абыйсціся без барацьбы з дваранскім сяродсценнем (еўрапейцамі рускага паходжання) – прыгоннікамі, якія не жадалі адмовіцца ад валодання “хрышчонай уласнасцю”.

Аднак ў сваіх памкненнях да рускага нацыянальнага адраджэння імператрыца вымушана была ўлічваць абставіны, пры якіх яна ўзышла на прастол. Усё жыцце ёй прыходзілася ўлічваць інтарэсы служылага дваранства, якое прывяло яе да ўлады, і ні на хвіліну не забываць, што ў любы момант яе бліжэйшае акружэнне можа арганізаваць ёй якія-небудзь "гемараідальныя колікі" ці "апаплексічны ўдар табакеркай у скроню". Само сабой зразумела, што яна мусіла праводзіць палітыку ў інтарэсах дваранства, хаця, як ніхто, разумела, што прыгоннае права – гэта перашкода развіццю і існаванню яе імперыі. Толькі гэтым можна растлумачыць яе дзеянні, скіраваныя на ўзмацненне пазіцый дваранства ў краіне. Пры Кацярыне II дваранства атрымала "даравальную грамату", якая канчаткова ператварыла яго ў высакароднае саслоўе з неабмежаванымі прывілеямі. Двараніна вызвалілі ад абавязковай службы, наогул, ад абавязкаў перад дзяржавай, пакаранняў, інакш як па рашэнню дваранскага суда. У 1767 г. яна нават забараніла сялянам скардзіцца прадстаўнікам дзяржавы на супрацьзаконныя дзеянні сваіх гаспадароў.

Сваім фаварытам "за верную службу" яна раздала цэлыя вобласці разам з насельніцтвам: сыну казака Разумоўскага разам з графскім тытулам было падаравана 100000 рэвізскіх душ, нашчадку вядомага авантурыста і казнакрада князя Меньшыкава – таксама 100000, а графу Пацёмкіну – больш за 200000 рэвізскіх душ (насельніцтва невялікай еўрапейскай дзяржавы) [3, с. 36]. У 1783 г. імператрыца распаўсюдзіла прыгоннае права на ўвесь раней вольны поўдзень Расіі і вольную Украіну. Звыш мільёна вольных сялян трапілі ў прыгонную залежнасць да фаварытаў імператрыцы і прадстаўнікоў кіруючай вярхушкі. Як росквіт старажытных Афін пры вольных грамадзянах забяспечвалі рабы, так росквіт рускага дваранства эпохі Кацярыны II забяспечвалі прыгонныя. Імператрыца адмяніла цялесныя пакаранні для дваран і першае нелупцаванае пакаленне спарадзіла бліскучае афіцэрства напалеонаўскіх войнаў, вальнадумцаў, дзекабрыстаў, безліч франдзёраў і вялікую дваранскую літаратуру на чале з А.С. Пушкіным, М.А. Някрасавым і Л.М. Талстым. Для яе было відавочным, што прыгонная праца меней выгодная, чым вольная. Упершыню пра гэта ў 1765 г. было надрукавана ў Працах Вольнага эканамічнага таварыства. Акрамя таго, імператрыца была

перакананая, што мільёны рабоў вельмі небяспечныя: генерал-пракурору А.А. Вяземскаму царыца пісала пра прыгонных: “Калі мы не пагодзімся на памяншэнне жорсткасцяў і палёгку чалавечаму роду яго нясцерпнага становішча, то і супраць нашай волі самі яны гэта возьмуць рана ці позна”.

Яшчэ ў канцы 1766 г. яна прыступіла да ажыццяўлення важнай акцыі свайго праўлення – склікання камісіі для складання новага “Уложения”. У выніку ва “Уложенную комиссию” было абрана каля 450 дэпутатаў ад розных сацыяльных груп. 33% складалі выбарныя ад дваранства, 36% – выбарныя ад гараджан, каля 20% – выбарныя ад сельскага насельніцтва і 5% – урадавыя службоўцы. Права выбіраць дэпутатаў былі пазбаўлены прыгонныя сяляне, якія складалі большасць насельніцтва краіны, і святары.

Перад пачаткам працы камісіі імператрыца склала “Наказ”, у якім выклала свае погляды на задачы камісіі. Асноўны тэкст “Наказу” – прадукт творчага пераасэнсавання ідэй Мантэскье, які браў за ўзор англійскі парламентарызм, адаптаваны імператрыцай да рускай рэчаіснасці. У “Наказе” Кацярыне II не ўдалося пераадолець супярэчнасці паміж рэаліямі феадальнай структуры грамадства і буржуазнымі догмамі, якія абвяшчаліся дзеячамі Асветы. Самым слабым месцам “Наказу” з’яўляецца рашэнне сялянскага пытання. У першапачатковым яго варыянце, які імператрыца давала чытаць вяльможам для крытыкі, сялянскаму пытанню было нададзена больш увагі і вырашалася яно больш радыкальна, чым у апублікаваным тэксце. “Я закрэсліла, разарвала і спаліла, – пісала Кацярына, – больш паловы, і Бог ведае. што станецца з астатнім” [3, с. 76]. З захаваных чарнавікоў відаць, што ў “Наказе” гаварылася пра жаданне вызваліць сялян ад асабістай залежнасці, пакінуўшы памешчыкам права на частку іх працы. Імператрыца лічыла магчымым дазволіць сялянам набываць волю за выкуп. У апублікаваным жа “Наказе” ўжо не гаварылася аб праве сялян набываць свабоду за выкуп, а толькі рэкамендавалася памешчыкам, каб тыя “з вялікай абачнасцю спаганялі свае паборы” [4, с. 415].

Пасля сваёй няўдачы ў справе правядзення праз камісію сялянскіх вольнасцяў імператрыца страціла інтарэс да камісіі і распусціла яе, тым больш, што для гэтага выдалася зручная магчымасць. У 1768 г. пачалася вайна з Турцыяй і значная частка

членаў камісіі павінна была быць ці на полі боя, ці ва ўстановах, якія забяспечваюць армію ўсім неабходным.

Не асмелілася імператрыца пайсці і на ўзмацненне ролі праваслаўнай царквы ў краіне. Наадварот, у другой палове XVIII ст. роля праваслаўя істотна знізілася пад уплывам масонствуючага акружэння Кацярыны II, кіраўнікамі Сінода станавіліся асобы без усякага духоўнага звання – свецкія чыноўнікі, інтарэсы якіх былі далёкімі ад інтарэсаў праваслаўнай царквы. На гэту пасаду траплялі нават зусім выпадковыя людзі: рэктар Маскоўскага ўніверсітэта прафесар і масон Ян Мелісіно і такі вядомы бязбожнік, як армейскі брыгадзір Пётр Пятровіч Чэбышаў. Іх дзейнасць на гэтай пасадзе была скіравана на зніжэнне эканамічнай магутнасці і палітычнай ролі царквы ў расійскім грамадстве.

У 1764 г. сваім указам Кацярына II правяла секулярызацыю царкоўных уладанняў, ў выніку чаго каля 2 мільёнаў душ манастырскіх сялян былі перададзены дзяржаве і падпарадкаваны Калегіі эканоміі. Гэта забяспечыла дадатковае паступленне ў казну 1,4 млн. рублёў, менш паловы з якіх адпускалася непасрэдна на ўтрыманне цэркваў, манастыроў, шпіталяў і багадзельняў. Акрамя таго, імператрыца ўстанавіла для кожнага манастыра дакладную колькасць манаствуючых. Больш паловы манастыроў было ўвогуле зачынена, асабліва на Поўначы і ў Сібіры, што мела адмоўнае значэнне для ўмацавання Расіі на ўскраінах. Так, у выніку знішчэння апоры рускай каланізацыі на Кольскім паўвостраве манастыра Трыфана Печанежскага частка Мурмана была захоплена Нарвегіяй.

Гэтым жа ўказам імператрыца зацвердзіла штаты манастыроў і ўпарадкавала іх колькасць. Будынкі зачыненых манастыроў ператвараліся ў казармы, шпіталі, лячэбніцы і г.д. Новыя манастыры ствараліся толькі з дазволу вышэйшай улады. Да канца XVIII ст. іх узнікла ўсяго толькі пяць [5, с. 32].

Нягледзячы на такое стаўленне да праваслаўя, асноўнага веравызнання ў Расіі, усё ж такі Кацярыну II можна аднесці да нацыянальных дзяржаўных лідэраў, бо яна пачала, так бы мовіць, русіфікацыю Расіі. На ключавыя пасады ў дзяржапараце, арміі, навуцы, адукацыі, мастацтве зноў сталі прызначацца рускія. Менавіта Кацярына II спыніла засілле ў Расійскай імперыі іншаземцаў..

Вядомы літаратар і крытык Ф.В. Булгарын у сваіх успамінах пісаў наступнае: “Імператрыца Кацярына ІІ, быўшы Вялікаю княгіняй, вывучыла характар Двара і рускага народа і прывязала да сябе сэрцы выяўленнем асаблівай любові да ўсяго рускага і народнага. У яе валадаранне заквітнела руская славеснасць, з’явіліся рускія мастакі, рускія навукоўцы і ўсе першыя месцы ў дзяржаве былі занятыя прыроднымі рускімі. Рускія палкаводцы вадзілі нашы войскі да перамог. Рускія саноўнікі кіравалі ўсімі часткамі дзяржаўнага механізму. Сама гасударыня здавалася рускай у самых дробных падрабязнасцях жыцця: апраналася па-руску, з рускімі заўсёды гаварыла на роднай мове і нават удзельнічала сваімі працамі ў рускай літаратуры. Праўленне яе было, у поўным значэнні слова, бліскучае і хвалебнае! Набыты новыя і багатыя вобласці, ва ўсім свеце грымелі перамогі, здабытыя рускімі на сушы і на моры; былі пабудаваныя новыя гарады, а старыя ўпрыгожаны; нададзены рух прамысловасці і гандлю…” [6, с. 86].

Безумоўнай заслугай імператрыцы стала школьная рэформа, якая па свайму характару насіла выразна вызначаны нацыянальны і пераважна свецкі характар. Менавіта асвету і школу разглядала яна ў якасці асноўнага інструмента ідэалагічнага выхавання падрастаючага пакалення ў духу адданасці прастолу, праваслаўнай веры і Радзіме. Істотны ўклад імператрыца ўнесла ў развіццё нацыянальнага друку, навукі і літаратуры, тэатра, дзе да канца XVIII ст. сфарміраваліся нацыянальныя кадры, якія амаль поўнасцю выцеснілі са свайго асяроддзя іншаземцаў.

Такім чынам, палітыка Кацярыны ІІ аказала істотны ўплыў на станаўленне і фарміраванне рускай нацыянальнай ідэі і нацыянальнай свядомасці, якая зацвярджалася непасрэдна дзяржавай праз падпарадкаваную ёй праваслаўную царкву, сістэму школьнай адукацыі, дзяржаўны кантроль за развіццём перыядычнага друку, тэатра, літаратуры і мастацтва.

Выкарыстаная літаратура
1. Солоневич, И.Л. Народная монархия / И.Л. Солоневич. – М.: Издательский дом “Римис”. – 113 с.
2. Башилов, Б. Златой век Екатерины / Б. Башилов. – Рязань: Русь, 2006. – 246 с.

3. Эйдельман, А.Я. “Революция сверху” в России/ А.Я. Эйдельман // Наука и жизнь. – 1988. № 11 – С. 71- 84.
4. Павленко, Н., Андреев, Н., Кобрин,В., Федоров В. История России с древнейших времен до 1861года / Н. Павленко, Н. Андреев, В. Кобрин, В. Федоров. – М.: Высшая школа, 1998. – 576 с.
5. Багдановіч, А.І. Фарміраванне ідэалагічных інстытутаў Расійскага самадзяржаўя ў XVIII – пачатку XIX стст. / А.І. Багдановіч // Гісторыка-археалагічны зборнік НАН Беларусі. Выпуск 25. – Мінск, 2010. – С. 30 – 34.
6. Булгарин, Ф. Воспоминания / Ф. Булгарин. – М.: Захаров, 2001. – 279 с.

## ЗАРАДЖЭННЕ ПАРАСТКАЎ ПАРТНЁРСКІХ АДНОСІН У ПРАЦОЎНАЙ СФЕРЫ БЕЛАРУСІ НА МЯЖЫ XIX – XX СТСТ.

Дубовік А.А.г. Мінск, БНТУ

Адным з асноўных тыпаў сацыяльна-працоўных адносін з’яўляецца партнёрскі, заснаваны на іх дагаворным рэгуляванні з улікам інтарэсаў усіх бакоў. Зараджэнне партнёрскіх адносін у працоўнай сферы адносіцца да канца XIX – пачатку XX стст. і было абумоўлена новымі рэаліямі, якія праявіліся ў развіцці капіталізму ў парэформеннай Беларусі. У гэты перыяд складваюцца пэўныя механізмы ўзаемадзеяння ў сістэме «дзяржава – прадпрымальнікі – рабочыя»; выпрацоўваецца фабрычна-заводскае заканадаўства, якое вызначала меру ўмяшальніцтва ўрада ў сферу працоўных адносін і адказнасці прадпрымальнікаў за жыццядзейнасць рабочых. Для нагляду за выкананнем фабрычнага заканадаўства і захаваннем парадку на прадпрыемствах у 1882 г. у Расіі, услед за еўрапейскімі краінамі, была заснавана фабрычная інспекцыя з чыноўнікаў Міністэрства фінансаў (у далейшым – Міністэрства гандлю і прамысловасці). Але ёй падпарадкоўваліся толькі цэнзавыя прадпрыемствы – тыя, што мелі не менш, чым 30 рабочых або не менш, чым 16 рабочых пры наяўнасці механічнага рухавіка [1, с. 212].

Парасткі сацыяльнага партнёрства фарміраваліся ў гэты перыяд па двух накірунках: узаемадзеянне гаспадароў і рабочых у